**Антонаў, К.** Хлопец са Стуканоў / К. Антонаў // Шлях перамогі (Глыбоцкі р-н). — 1989. — 11 мая. — С. 2.

**ХЛОПЕЦ СА СТУКАНОЎ**



**«Прашу паведаміць гр. Сандзюку Веньяміну Паўлавічу, пражываючаму ў вёсцы Стуканы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці аб тым, што яго сын, тапагеадэзіст, радавы Сандзюк Леанід Веньямінавіч, 1962 года нараджэння, прызваны ў Савецкую Армію 30 сакавіка 1981 года Вілейскім раённым ваенным камісарыятам Мінскай вобласці, у баі за нашу Савецкую Радзіму, верны ваеннай прысязе, праявіўшы геройства і мужнасць, загінуў 12 лютага 1982 года.**

Камандзір часці (подпіс).

Начальнік штаба (подпіс).

Апрача гэтага трафарэтнага лістка, пачкі салдацкіх пісем і магілы на ўскрайку вёскі Стуканы так нічога і не засталося ад жыццярадаснага Лёнькі Сандзюка, калі не лічыць выплаканага матчынага сэрца ды пастарэўшага раптам на дзесятак гадоў бацькі. Напісаў «нічога», і тут жа закралася сумненне: ці маю права так катэгарычна заяўляць? Зразумела, не. Добрая памяць надоўга застанецца ў тых, хто разам вучыўся і вучыў ва Узрэцкай школе, у Ільянскім тэхнікуме. Ды і дома, у Стуканах, пра яго можна пачуць толькі добрыя словы: працавіты, паслухмяны, паважлівы да старэйшых. На жаль, гаворыцца ўсё гэта ўжо ў мінулым часе.

У сям'і Сандзюкоў Лёня быў другім, пасля Тані, а ўслед за ім былі яшчэ Оля, Юра. Бацькі Веньямін Паўлавіч і Галіна Андрэеўна на калгаснай ферме працавалі. Вось і прызвычаіўся бегаць да іх Лёня. Спачатку проста так, час бавіць, а затым і дапамагаць стаў. Магчыма, гэта і вызначыла яго далейшы шлях. Пасля заканчэння Узрэцкай васьмігодкі ў Ільянскі тэхнікум паступіў на ветэрынарнае аддзяленне. Наязджаючы дамоў, абавязкова бываў на ферме і ацэньваў ужо парадкі на ёй як будучы снецыяліст.

– Пачакайце, вось закончу вучобу – абавязкова ў Стуканы вярнуся. Тады мы іншы парадак тут навядзём, – абяцаў ён бацькам.

Але склалася ўсё інакш. Па размеркаванню трапіў зусім у іншае месца, і нават не ў сваю вобласць. Гэта было ў пачатку сакавіка 1981 года. А праз тыдні два нечакана заявіўся дамоў.

– Што здарылася? – устрывожыліся бацькі. – З работай не ў парадку? – Ды ўсё нармальна, – супакоіў іх Леанід. – Павестку вось з ваенкамата атрымаў. Трэба ў арміі паслужыць.

Да паведамлення сына бацькі аднесліся больш-менш спакойна. Не ён першы, не ён апошні. Справілі па традыцыі «провады», і Леанід паехаў на прызыўны пункт у Вілейку, дзе стаяў на ўліку. Яшчэ праз тыдні два Сандзюкі атрымалі першы салдацкі ліст ад сына. Пісаў, што ў яго ўсё добра, што служыць у Туркменіі. З таго часу пісьмы пачалі ісці рэгулярна. Леанід расказваў аб новых, нябачаных раней мясцінах, аб службе. Праўда, потым стаў намякаць, што магчыма ў яго салдацкім жыцці адбудуцца перамены, прасіў не хвалявацца нават тады, калі ад яго нейкі час пісем не будзе.

Неўзабаве пісьмы перасталі прыходзіць. Трывога закралася ў сэрцы родных. Аднак спадзяваліся, што ўсё абыдзецца, хоць і ішлі ўжо чуткі аб тым, што з Афганістана часам хлопцы не вяртаюцца самі, а прывозяць іх у дамавіне.

Нарэшце прыйшло доўгачаканае пісьмо. На гэты раз яно было сапраўды з Афганістана. Леанід супакойваў, падбадзёрваў бацькоў.

«Добры дзень, мае дарагія родныя: тата, мама і Юра, – пісаў ён 31 студзеня 1982 года. – З гарачым салдацкім прывітаннем і масай самых найлепшых пажаданняў да Вас Лёня. Вось рашыў напісаць Вам невялікае пісьмо. Справы ў мяне ідуць нармальна, жывы і здаровы, служба таксама ідзе добра. Я Вам жадаю ўсяго найлепшага ў Вашым жыцці. Навін у мяне ніякіх няма. Сёння ў нас 31 студзеня, пазаўчора выпаў снег і зараз яшчэ крыху ёсць. Надвор'е ў асноўным нядрэннае.

Заставайцеся жывымі і здаровымі. Перадавайце ўсім прывітанне.

Да пабачэння.

Моцна цалую. Лёня».

У ранейшых пісьмах Леанід расказваў аб гарах, аб тым, што Новы год сустракалі без снегу, прасіў паведаміць, што дома гавораць аб Афганістане.

А гэтае пісьмо было апошнім. 12 лютага Лёні не стала. А праз некалькі дзён у сям'ю вярнулася, пасланае пісьмо з лаканічнай паметкай: «Адрасат выбыў» і страшнае вышэй названае паведамленне.

Потым было пахаванне. Аддадзена апошняе воінскае ўшанаванне, пра-гучаў развітальны салют. І вось вырасла яшчэ адна магіла. Потым будуць яшчэ такія, хоць і на другіх могілках, але ў нашым раёне.

Не адразу ўдалося даведацца аб абставінах смерці Леаніда. Ці варта напамінаць, шхо гэта было ў пачатку 1982 года, калі ўсё трымалася ў сакрэце, адсутнічала галоснасць. І ўсё ж па просьбе бацькоў з воінскай часці, дзе служыў Леанід, паведамілі некаторыя падрабязнасці. У час аднаго з абстрэлаў загарэлася палатка-склад, у якой знаходзіліся боепрыпасы. Леанід, не чакаючы загаду, кінуўся тушыць яе. Інакш пасгупіць ён не мог, бо ведаў, што пры выбуху боепрыпасаў загінуць і яго таварышы. Агонь з дапамогай іншых падаспеўшых салдат удалося патушыць. Але выпушчаны душманамі яшчэ адзін снарад разарваўся непадалёк. Цяжка параненага Леаніда даставілі ў шпіталь. Праз суткі ён памёр ад ран.

...Хутка бяжыць час. Сем гадоў прайшло ўжо. Павыходзілі замуж сёстры. Сёлета бацькі чакаюць з арміі малодшага Юру, які служыць у па-ветраных войсках. Жыццё ідзе сваёй чарадой. І ўсё ж з яго не выкрасліць памяці аб тых, хто, верны Радзіме і воінскаму абавязку, аддаў сваё маладое жыццё, выканаўшы да канца свой салдацкі доўг.

**К. АНТОНАЎ, в. Стуканы**

НА ЗДЫМКУ: Леанід Сандзюк

Фота з сямейнага альбома